## I варыянт

1. Пералічыце дзяржавы, якія ўваходзілі ў склад ваенна-палітычнага блока Антанта: *а) Англія; б) Іспанія; в) Францыя; г) Расія; д) Італія?*

2. Запоўніце прапушчаныя ў сказе месцы: Першая сусветная вайна скончылася … падпісаннем … *(3 сакавіка 1918 г., 11 лістапада 1918 г., Камп'енскага перамір'я, Брэст-Літоўскага міра).*

3. Канфлікт паміж якімі дзвюма дзяржавамі стаў нагодай да пачатку Першай сусветнай вайны: *а) Аўстраліяй; б) Аўстра-Венгрыяй; в) Грэцыяй; г) Румыніяй; д) Сербіяй?*

4. Упершыню гэты новы від узбраенняў быў выкарыстаны ў бітве на рацэ Соме ў 1916 г. Адным сваім выглядам нябачныя дагэтуль машыны наводзілі жах на праціўніка. У будучым выкарыстоўваліся з абодвух бакоў. Пра што ідзе гаворка?

5. Устанавіце адпаведнасць:
*а) Х.Мольтке; б) М.Д.Зялінскі; в) А.Брусілаў; г) Г.Прынцып – 1) член падпольнай сербскай арганізацыі, удзельнік "сараеўскага забойства"; 2) фельдмаршал, начальнік Генеральнага штаба Германіі ў 1914 г.; 3) рускі хімік, вынайшаў вугальны процівагаз; 4) рускі военачальнік.*

6. Устанавіце адпаведнасць:
*а) уступленне ў вайну ЗША; б) "вердэнская мясарубка"; в) першая газавая атака (прымяненне атрутнага рэчыва – хлору) у Першай сусветнай вайне; г) бітва на Марне – 1) 5–12 верасня 1914 г.; 2) красавік 1915 г.; 3) 21 лютага–21 снежня 1916 г.; 4) красавік 1917 г.*

7. Працягніце сказ: *Ваенны план германскага камандавання, які прадугледжваў кароткачасовую вайну, разгром армій праціўніка па-асобку, не дапускаючы вайны на два фронты, называецца…*

8. Што аб'ядноўвае наступных гістарычных асоб: *Ж.Жофр, А.Петэн, Ф.Фош?*

9. Прачытайце ўважліва ўрывак з дакумента і адкажыце на пытанні: *"…Расія, з аднаго боку, і Германія, Аўстра-Венгрыя, Балгарыя і Турцыя – з другога, абвяшчаюць, што стан вайны паміж імі спынены. Яны вырашылі жыць паміж сабой у міры і сяброўстве… Расія неадкладна ажыццявіць поўную дэмабілізацыю сваёй арміі… Вобласці, што размяшчаюцца на захад ад устаноўленай бакамі лініі і раней належалі Расіі, не будуць больш знаходзіцца пад яе ўладай… Расія адмаўляецца ад усялякага ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы гэтых абласцей…"*

- Што гэта за дакумент?
- Калі і дзе быў падпісаны дадзены дакумент?
- Што ён азначаў?

## II варыянт

1. Пералічыце дзяржавы, якія ўваходзілі ў блок Цэнтральных дзяржаў (Чацвярнога саюза): *а) Балгарыя; б) Аўстра-Венгрыя; в) Германія; г) Румынія; д) Асманская імперыя?*

2. Запоўніце прапушчаныя ў сказе месцы: Пачаткам Першай сусветнай вайны лічыцца… , калі Германія аб'явіла вайну *…(28 ліпеня 1914 г., 1 жніўня 1914 г., Францыі, Расіі).*

3. Якія дзяржавы не былі саюзнікамі блока Антанта:
*а) Японія; б) Кітай; в) Швецыя; г) Бразілія; д) Швейцарыя?*

4. Упершыню гэта новая зброя масавага знішчэння была прыменена ў красавіку 1915 г. на Заходнім фронце, праз два тыдні немцы правялі падобную атаку і на Усходнім фронце. У далейшым прымянялася абодвума бакамі. Аб якой зброі ідзе гаворка?

5. Устанавіце адпаведнасць: *а) Франц Фердынанд; б) Т.В.Вільсан; в) Фердынанд Фош; г) Ж.Клемансо – 1) прэзідэнт ЗША ў 1913–1921 гг.; 2) французскі военачальнік, маршал, генералісімус; 3) наследнік аўстра-венгерскага прастола, ахвяра "сараеўскага забойства"; 4) прэм'ер-міністр Францыі ў 1917–1920 гг.*

6. Устанавіце адпаведнасць:*а) бітва на рацэ Соме; б) "брусілаўскі прарыў"; в) другая бітва на Марне; г) Усходне-Пруская аперацыя рускіх войскаў – 1) жнівень–верасень 1914 г.; 2) май–ліпень 1916 г.; 3) ліпень–лістапад 1916 г.; 4) ліпень–жнівень 1918 г.*

7. Працягніце сказ: *Няспынны рост ваеннага патэнцыялу краін, павелічэнне колькасці армій, ваенных бюджэтаў, з'яўленне і развіццё новых відаў узбраенняў, імкненне дзяржаў не саступаць адна адной у ваенных адносінах выражаецца паняццем…*

8. Што аб'ядноўвае наступных гістарычных асоб: *Х.Мольтке, П.фон Гіндэнбург, Э.Людэндорф?*

9. Прачытайце ўважліва дакумент і адкажыце на пытанні: *"…Канец узброенных дзеянняў на сушы і ў паветры на працягу шасці гадзін пасля падпісання… Неадкладна пачаць і завяршыць у 15-дзённы тэрмін эвакуацыю ўсіх нямецкіх войскаў з Францыі, Бельгіі, Люксембурга і Эльзаса-Латарынгіі… Эвакуацыя ўсіх нямецкіх войскаў на Усходнім фронце на тэрыторыю Германіі, на пазіцыі па стану на 1 жніўня 1914 года… Здача ў добрым стане 5000 гармат, 25000 кулямётаў, 3000 марцір-мінамётаў, 1700 самалётаў, 5000 цягнікоў и 150000 вагонаў…"*

- Што гэта за дакумент?
- Дзе і калі быў падпісаны дадзены дакумент?
- Якое значэнне дакумента?